СПАЛІЦЬ НЕЛЬГА ЗНЕСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Так і ёсць: цяпер названая і навакольныя вёскі ўваходзяць у адно з лясніцтваў нацыянальнага парку «Белавежская пушча». А драўніна з пушчы заўсёды лічылася адмысловым будаўнічым матэрыялам... Праз аконныя праёмы відаць, што ў даволі вялікім доме разабраны печы, здзёрта падлога. Пад падлогай ляжыць ядловец — некалі клапатлівы гаспадар выкарыстаў яго, каб мышы не вадзіліся, каб цяпло захоўвалася і здаровае паветра было ў доме. І вось гэты дом хутка пойдзе пад знос, калі цяперашняя гаспадыня напіша адмову. Мяркуючы па яе абыякавасці, так і будзе.

У суседнім Пелішчанскім сельсавеце, дзе хаты актыўна купляюцца, бо населеныя пункты недалёка ад Брэста, таксама ёсць так званыя «тупіковыя» домаўладанні. У аграгарадку Пелішча, дзе падведзены газ і водаправод, на цэнтральнай вуліцы стаіць дом, у якім таксама ўваліўся дах. Не магла не пацікавіцца ім у **старшыні сельскага Савета Уладзіміра ТОЛАХА**. «Там, вядома, ніхто не жыве, але зарэгістраваны два чалавекі, — расказаў старшыня. Бацька пасля адбыцця тэрміну пакарання вярнуўся ў вёску, працуе ў гаспадарцы, здымае кут. Сын наогул невядома дзе. Без згоды маладога старэйшы не можа распарадзіцца домам, каб і хацеў. Ёсць людзі, якія купілі б старую пабудову нават з-за ўчастка, але гэта зрабіць немагчыма». І напаўразбуранае жытло мусіць псаваць увесь знешні выгляд цэнтральнай вуліцы аграгарадка.

У астатніх населеных пунктах Пелішчанскага сельсавета работа па выкананні Указа №100 вядзецца згодна з планам.

У Рэчыцкім сельсавеце, адкуль была скарга, яна ўскладняецца некаторымі акалічнасцямі. Па-першае, у склад тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі ўваходзіць 30 населеных пунктаў, з якіх дзясятак — зусім малыя вёскі, якія фактычна выміраюць, хат-сірот з кожным годам становіцца болей. Зараз у сельсавецкіх спісах налічваецца 93 пустуючыя дамы. Шэсць чакаюць сваёй чаргі на знос. Па-другое, Рэчыца была першай вёскай у раёне, а можа, нават і ў вобласці, у якой скасавалі былы калгас. Зямлю ў асноўным раздалі фермерам, прыватным гаспадарам. Адным словам, гаспадаркі тут няма. Напрыклад, у Пружанскім раёне львіную долю работы па зносе жылля праводзяць сельгаспрадпрыемствы з наступным увядзеннем зямель у севазварот, альбо пасля разборкі забіраюць участкі для будаўніцтва жылля («Дзе дом стаяў, там рапс расце». «МС» ад 25 сакавіка г.г. — **Аўт.**).

Рэчыцкаму ж сельвыканкаму даводзіцца наймаць для гэтай работы самыя розныя арганізацыі. Апошнім часам і ў Антанах, і ў іншых вёсках працавалі работнікі райаддзела МНС. Яго **начальнік Уладзімір ІВАНЮКОВІЧ** расказаў карэспандэнту газеты, як праводзіцца знос дамоў:

— Гэта ж не значыць, што прыехалі, падпалілі з чатырох бакоў і стаялі-чакалі, пакуль дом згарыць. Пасля заключэння дагавора мы выязджаем на месца, аглядаем збудаванне, тэрыторыю, абавязкова прапануем насельніцтву прыдатную на паліва драўніну, а таксама цэглу, якая застаецца ад разбору печаў. Дом разбіраем, а трухлявыя, іншыя драўляныя рэшткі спальваем, захоўваючы ўсе меры бяспекі. Побач заўсёды знаходзіцца аўтацыстэрна з вадой.

Так было і на гэты раз, толькі, можа, паліць давялося крыху больш, бо ахвотных забраць драўніну не знайшлося. Праўда, з пенсіянеркай-суседкай адбылася не самая прыемная размова. Яе можна зразумець... Але ж вывозіць драўніну на палігон бытавых адходаў мы не маем права. Астаткі бітай цэглы і тое, што засталося на папялішчы, мы закапалі, тэрыторыю разраўнавалі, — патлумачыў Уладзімір Уладзіміравіч.

Сапраўды, калі не ведаеш, можна не здагадацца, што калісьці тут стаяў дом. Толькі збоку чарнее след ад вялікага вогнішча, які вясной схавае маладая расліннасць.

* * *

Праблемы з захаваннем заканадаўства як быццам і няма ў гэтай гісторыі. Але ж відавочныя праблемы сацыяльныя, нават этычныя. Калі старым людзям, якія пражылі век побач з суседзямі, цяжка ўспрыняць, усвядоміць, што будынак адыходзіць у нябыт з агнём. Тым больш знос ажыццяўляе пажарная служба. Але ж гэта, згадзіцеся, адзіная служба, якая можа правесці названую работу па ўсіх правілах бяспекі.

Ну а сацыяльны аспект вядомы: пусцеюць вёскі, былыя хаты нікому не патрэбны — нават на дровы. Як сказаў адзін пажылы месціч, хітравата ўсміхнуўшыся: у пушчы ніхто трухлявымі дровамі ў печы не паліць. А вось заяўнік Леанід Міранюк лічыць, што асобны «кантынгент» людзей быў бы рады і такому паліву. «Няхай бы сельсавет паклапаціўся дом разабраць і адвезці дровы ў Рэчыцу. Там ёсць жыхары, у якіх і палена дроў ніколі не было», — горача даводзіў ён. Аказалася, чуллівы вясковец клапоціцца пра мясцовых п'яніц і дармаедаў, якія сябе нарыхтоўкай дроў не абцяжараваюць. Яны ж не спяшаюцца наняць падводу ці трактар і прывезці на свой падворак бярвенне ад разбору. Дык чаму сельсавет павінен рабіць гэта за кошт падаткаплацельшчыкаў? Нічыйныя дамы, дарэчы, нярэдка гараць і па віне гэтых самых бамжоў ды іншых асацыяльных асоб. І тады сапраўды ўяўляюць небяспеку для суседніх будынкаў.

Ды нельга не пагадзіцца з адной з апошніх жыхарак Антаноў: нічога добрага няма ў тым, што гарыць дом, які некалі ўзводзілі з вялікімі цяжкасцямі, адмаўляючы сабе ў апошнім. І сёння гэта цалкам на сумленні спадчыннікаў дамоў, якія сталі нічыйнымі.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

yackevich@zviazda.by

Камянецкі раён.

УЧАСТАК

А ФОТА — НА ДОШКУ!

Як у глыбінцы змагаюцца са злачыннасцю

«Цёмныя справы» робяцца цішком ды не пры сведках. І калі раптам яны становяцца здабыткам грамадскасці, чалавек гатовы скрозь зямлю праваліцца... У Дамамерыцкім сельсавеце Клімавіцкага раёна такі спосаб вядзення барацьбы з законанепаслухмянымі грамадзянамі, як змяшчэнне іх фота на «дошцы ганьбы», зарэкамендаваў сябе як найбольш эфектыўны. А мясцовы савет грамадскага пункта аховы правапарадку па выніках года прызнаны адным з найлепшых у вобласці. І ў гэтым не апошняя заслуга ўчастковага.

Пра такіх, як Вадзім Панасенка, кажуць: малады і перспектыўны. Зусім нядаўна ён атрымаў званне лейтэнанта і з малодшага ўчастковага інспектара міліцыі «вырас» у паўнавартаснага ўчастковага. Яго тэрыторыя — увесь Дамамерыцкі сельсавет плюс некалькі вёсак, якія знаходзяцца непадалёку ад Клімавіч. Абавязкаў шмат, але галоўнае — прафілактыка. Нельга, каб справа даходзіла да злачынства.

— Калі прыйшоў на ўчастак, першай справай пазнаёміўся са старшынямі сельскага Савета і калгаса, дырэктарамі школ (на ўчастку іх дзве), кіраўнікамі розных арганізацый. У нашай рабоце вельмі важна ведаць кожнага асабіста і ўзаемадзейнічаць, тады і працаваць прасцей, — кажа ён. — Які сэнс у саветах грамадскага пункта аховы правапарадку, калі няма ўзаемадапамогі? Вось у школе звярнулі ўвагу на дзяцей з так званай групы рызыкі — я адразу ж з імі пазнаёміўся, пагутарыў. Трэба ведаць, адкуль што можна чакаць.

Абавязкаў у інспектара шмат. Трэба кантраляваць асоб, якія стаяць на ўліку, выхоўваць тых, што спатыкнуўся, прымаць меры да парушальнікаў, займацца прафілактыкай... Але ж Вадзім Панасенка спраўляецца, і за гады працы ў прафесіі не расчараваўся. Нават сястра ўзяла з яго прыклад — цяпер працуе следчай.

— Праца ў мяне нялёгкая, прыходзіцца і рызыкаваць, і ў засадах сядзець, — кажа суразмоўца. — На вёсцы хапае ахвотнікаў падзарабіць на самагонаварэнні. Аднойчы за адным такім домам дзве гадзіны сачылі, затое вывелі парушальнікаў на чыстую ваду.

Вельмі гарачымі бываюць сямейныя скандалы. Некаторыя раз'юшаныя асобы нават з нажом на міліцыянера кідаюцца. «Даводзіцца падыход шукаць, каб чалавек спачатку супакоіўся», — кажа інспектар.

Ёсць на ўчастку сям'я, ад якой пакутуюць усе ў акрузе. У дом не зайсці — бруд, смурод... Але ж людзі маюць псіхічныя захворванні — як на іх паўплываеш? Для іх кантроль нават на карысць, бо самастойна яны не ў стане нават дровы на зіму нарыхтаваць. Перыядычна, пакуль яны на лячэнні, камунальныя службы стараюцца крыху навесці каля дома парадак. Потым усё зноў паўтараецца. П'янкі, міліцыя, бальніца...

— Лягчэй за ўсё дамовіцца з падлеткамі, — кажа Вадзім Панасенка. — Быў у мяне адзін такі задзіра, на дыскатэках ад яго паратунку не было. Два гады з ім змагаўся — цяпер зусім іншы чалавек стаў, у міліцыю збіраецца ісці працаваць. Я яго некалькі разоў з сабой браў, каб паглядзеў, з чым давядзецца сутыкацца.

Участковы інспектар Вадзім ПАНАСЕНКА і старшыня Дамамерыцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ЗАСТРЭЛАЎ.

— На плячах участковага ўся прафілактыка, — дадае **старшыня Дамамерыцкага сельскага Савета, а па сумяшчальніцтве і савета грамадскага пункта аховы правапарадку Аляксандр ЗАСТРЭЛАЎ**. — 15-20 гадоў таму было прасцей, цяпер моладзь больш «прасунутая», іх цяжэй чымсьці напалохаць, яны добра падкаваныя — інтэрнэт дапамагае.

Савет грамадскага пункта аховы правапарадку, на думку старшыні, — гэта вельмі добры спосаб прафілактыкі. Калі, вядома, працаваць сумленна. Тут з пастаяннымі «кліентамі» не вельмі цырымоняцца: вешаюць фота на «дошку ганьбы» і гэта добра спрацоўвае. Слава пра «героя» хутка распаўсюджваецца па акрузе, і ён потым просіць, каб фота знялі. Абяцае выправіцца.

На пасяджэнні савета трапляюць не толькі злосныя парушальнікі закона. Тут і сямейныя скандалісты, і тыя, хто парушае правілы дарожнага руху, і дармаеды... Для некаторых дастаткова адной сустрэчы, іншыя трапляюць на прафілактычныя гутаркі па некалькі разоў. Ёсць, праўда, «кліенты» па 5-6 разоў судзімыя — такіх ніякімі дошкамі не праняць. Але ж і на іх знаходзіцца ўправа.

Старшыня сельскага Савета лічыць, што яму з участковым пашанцавала. Кожную раніцу ўжо на тэлефоннай сувязі. Пры такім кантролі нечаканасці амаль што выключаны.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Фота аўтара.

НА ПРЫЁМЕ

ЭКСПЕРТЫЗА СУПРАЦЬ ЗЛОДЗЕЯ

Зараз усе абласныя цэнтры Беларусі маюць самае сучаснае абсталяванне, з дапамогай якога эксперты на працягу 40 хвілін вызначаюць любы наркотык. Пра гэта расказаў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Беларусі Пётр Урублеўскі, які ў Светлагорску правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях. Мясцовыя жыхары цікавіліся парадкам правядзення паўторных экспертыз.

Дарэчы, генерал-маёр юстыцыі адзначыў, што пасля прыняцця Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Пра неадкладныя меры па супрацьдзеянні незаконнаму абарачэнню наркотыкаў» назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння ўжывання сінтэтычных рэчываў. Цяпер аматары злавіць кайф аддаюць перавагу марыхуане і гашышу. Сёлета на ўлік было пастаўлена дзевяць сінтэтычных наркотыкаў, якія яшчэ ў Беларусі не выяўляліся:

— Можна сцвярджаць, што дзякуючы правядзенню экспертыз з дапамогай храматамасспектрометраў ніводны наркагандляр не зможа пазбегнуць адказнасці з прычыны таго, што наркотык усё яшчэ «легальны». Мы сёлета ўпершыню пачалі праводзіць экспертызы па злачынствах сексуальнага характару, здзейсненых у дачыненні непаўналетніх, з выкарыстаннем паліграфа. Цяпер мы звыш 99% даследаванняў выконваем за месяц. Параўнайце: у 2014 годзе — толькі 1,6%. Пры гэтым колькасць экспертыз значна павялічылася.

Адным з самых важных кірункаў застаецца правядзенне генатыпаскапічных экспертыз: па слядах крыві, напрыклад, можна ідэнтыфікаваць злачынцу. Сёння спецыялісты Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз могуць устанавіць, напрыклад, месца паходжання драўніны пры незаконнай высечцы лесу або правесці даследаванне ДНК жывёл пры незаконным паляванні. Развіццё ў экспертнай практыцы атрымліваюць складаныя будаўніча-тэхнічныя, эканамічныя, камп'ютарна-тэхнічныя экспертызы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

ЗАКАЛЬЦАВАЦЬ... ЖОДЗІНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

З гэтай мэтай надрукаваны плакаты, брашуры, календары. Прадукцыю распаўсюдзілі ва ўстановах адукацыі, месцах масавага знаходжання людзей. У межах акцыі «Актыўны рух замест пасіўнага курэння. Усё пачынаецца з сям'і» прайшлі дзіцячыя гонкі на бегавелах і самакатах. Арганізавалі пяць велапрабегаў па значных для горада месцах. А сярод дашкольнікаў правялі конкурсы, каб прывіць ім навыкі язды на веласіпедзе, паказаць веласіпед як альтэрнатыву аўтамабілю.

Дарэчы, ініцыятарам развіцця веласіпеднага руху выступіў Маладзёжны цэнтр пры гарвыканкаме. Менавіта яго прадстаўнікі прыйшлі ў гарадскі Савет дэпутатаў і выказалі свае пажаданні і прапановы. І знайшлі разуменне і падтрымку.

> Народныя абраннікі разам з архітэктарам прайшлі пешшу па ўсіх чатырох вуліцах, вывучылі і прааналізавалі сітуацыю, каб падрыхтаваць схему будучага веласіпеднага кольца.

Праект рэалізуецца ў межах Стратэгіі ўстойлівага развіцця г. Жодзіна разам з італьянскімі партнёрамі. На ўладкаванне першага веласіпеднага кольца затрачана 13 тыс. еўра. Такая маштабная задума запатрабавала не толькі сродкаў, але і чалавечых высілкаў. Былі падключаны грамадскасць, службы горада, дэпутаты, усе неабыякавыя і зацікаўленыя людзі. Народныя абраннікі разам з архітэктарам прайшлі пешшу па ўсіх чатырох вуліцах, вывучылі і прааналізавалі сітуацыю, каб падрыхтаваць схему будучага веласіпеднага кольца.

— Веласіпедны маршрут у цэнтры — толькі першы крок. Мы ж хочам «закальцаваць» увесь горад, — запэўнівае Наталля Міхайлаўна. — Як і ў краінах Еўропы, нашы людзі ўсё часцей перасаджваюцца на веласіпеды. Неабавязкова мець свой ровар. З мінулага года ў нас працуе пункт пракату. Гэтым відам транспарту карыстаюцца не толькі маладыя, але і сталыя людзі.

Цяпер у Жодзіне актыўна займаюцца распрацоўкай праектна-каштарыснай дакументацыі для стварэння другога веласіпеднага кольца. Праўда, калі канкрэтна яно з'явіцца, невядома: усё залежыць ад фінансавання. «Пакуль вызначаемся, за які кошт яго ўзводзіць. Магчыма, гэта будуць бюджэтныя сродкі, магчыма, увойдзем у нейкі новы праект. Або знойдзем спонсараў, заробім на суботніку, — кажа старшыня гарадскога Савета. — Але можна з упэўненасцю сказаць, што намечанае будзе зроблена».

Дарэчы, Жодзіна даў краіне шмат прызёраў і чэмпіёнаў свету і Еўропы ў такіх відах спорту, як грэбля, барацьба, цяжкая атлетыка, мастацкая гімнастыка. Магчыма, з цягам часу новыя зоркі з'явяцца і ў веласіпедным спорце.

lazovskaya@zviazda.by

БІЗНЕС-ШКОЛА

ПРАЦУЙЦЕ НА СЯБЕ,

а імя і вопыт... можна арандаваць!

Для таго, каб стаць бізнесменам, аднаго толькі жадання недастаткова. Перад чалавекам непазбежна паўстане шэраг пытанняў. З чаго пачаць? Куды пайсці па кансультацыю? Дзе ўзяць грошы і колькі іх спатрэбіцца для сваёй справы?

Ільготныя крэдыты і іншае

Сёлета на Віцебшчыне распачалі сваю справу больш за 200 беспрацоўных. Цікава, што яны пачалі займацца і новымі відамі паслуг.

— Напрыклад, прапануюць чыстку і прыборку вытворчых і жылых памяшканняў і транспарту, прыбіранне будынкаў пасля будаўніцтва. Сярод новых кірункаў дзейнасці — чыстка дываноў, дывановых пакрыццяў, мяккай мэблі, драпіровак, фіранак... Атрыманую субсідыю пры арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці беспрацоўныя выкарысталі на набыццё інструментаў, абсталявання і матэрыялаў, — распавядае **Ірына МАТВЕЕВА, намеснік старшыні камітэта па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама**.

Кансультуюць беспрацоўных і аказваюць ім метадалагічную дапамогу бясплатна. У прыватнасці, дапамогуць і бізнес-план скласці.

А калі чалавек працуе, але хоча пачаць уласную справу, куды ісці па кансультацыю? Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу аказвае паслугі ў якасці цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва. Тут пра нюансы бізнесу даходліва распавядуць, як той казаў, і піянеру, і пенсіянеру.

— Нашаму прадпрыемству ў 2007 годзе Міністэрствам эканомікі прысвоены статус базавага (абласнога) цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва. Аказваем грамадзянам дапамогу ў падрыхтоўцы бізнес-планаў. А бізнесменаў запрашаем браць удзел у канферэнцыях і форумах, выставах і кірмашах, — тлумачыць **дырэктар цэнтра Ірына МАКАРАНКА**.

Супрацоўнікі цэнтра ў ліку іншага правялі маштабнае маркетынгавае даследаванне патэнцыялу глыбінкі, каб выявіць свабодныя рыначныя нішы. Ажыццяўляюць і даследаванні пераваг пакупнікоў у дачыненні да розных відаў прадукцыі. Праводзяць аналіз канкурэнтных пераваг тавараў, паслуг і іншае.

У краіне ўжо трэці дзясятак гадоў дзейнічае Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў. І там рады падтрымаць ініцыятыўных людзей.

— Фонд пачаў работу са студзеня 1992 года. І, зразумела, за столькі часу назапасіў багаты вопыт аказання падтрымкі суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці. Ім прадастаўляюцца пазыкі. Займаемся і фінансавай арэндай маёмасці (лізінг). Многіх дзелавых людзей цікавіць магчымасць гарантый па льготных крэдытах. Усяго мы фінансавалі больш за 1200 прадпрымальніцкіх праектаў. Яны накіраваны на стварэнне і развіццё вытворчасці, арганізацыю выпуску прадукцыі на экспарт, а таксама на замяшчэнне імпартнай прадукцыі. Спрыялі ўкараненню новых тэхналогій. Абавязковай умовай атрымання пазыковых грашовых сродкаў і маёмасці на ўмовах фінансавай арэнды з'яўляецца стварэнне новых працоўных месцаў, — адзначыў **генеральны дырэктар фонду Дзмітрый ЯЎМЕНЧЫК**.

Разводзіцеся? Найміце пасярэдніка

Для людзей, далёкіх ад бізнесу, словы: «франчайзінг» і «франшыза», верагодна, асацыююцца з медыцынскім тэрмінам? У нашай краіне тая ж франшыза ў параўнанні з суседнімі краінамі — «немаўля».

— Калі папросту, франчайзінг — гэта арэнда чужога імя і чужога вопыту. Прадпрымальніку не трэба эксперыментаваць, думаць, ці будуць запатрабаваныя, напрыклад, яго крама, паслугі. Замест гэтага ён знаходзіць паспяховы прыклад і ўбудоўваецца ў «сетку», якая добра сябе зарэкамендавала, — расказвае **Вольга ЛЯВОНЦЬЕВА, старшыня асацыяцыі «Белфранчайзінг»**. — Дарэчы, і «Макдональдс» у топавым спісе ўсім вядомых франшыз. Ёсць для нас і вельмі дзіўныя. Сярод іх такія паслугі, як навядзенне парадку на месцах злачынстваў, пасярэдніцтва ў працэсе разводу... Дзейнічаюць і цэнтры дапамогі ў атрыманні амерыканскіх віз, і музеі шакаладу. Распаўсюджаны бізнес па аздараўленні і доглядзе... Наконт цаны: франшызу можна купіць і за пару тысяч долараў, і за некалькі мільёнаў. Пакупнікамі штомесяц робяцца пералічэнні ў памеры некалькіх працэнтаў. У нас у краіне найбольш запатрабаваныя франшызы датычацца тавараў для дзяцей і моладзі, фастфуду або закусачных з нізкім чэкам. Запатрабавана і тое, што звязана са здаровым ладам жыцця, — працягвае эксперт.

Франшыза зручная для дзелавых людзей тым, што акрамя імя, гарантуецца падтрымка і дапамога ў выпраўленні памылак, кансультацыі ў самых разнастайных пытаннях. Усё: ад дзеянняў персаналу, які рыхтуецца ў «галаўным офісе», да выгляду памяшкання прапісана ў адпаведных рэкамендацыях: ажно да ўказання часу для выцірання ўваходных дзвярэй.

Усё больш з'яўляецца франшыз, народжаных у нашай краіне. Беларусы прадаюць землякам і іншаземцам свой досвед! Чым не падстава для гонару?

— Бадай, «Мілавіца» — самы вядомы беларускі брэнд. У Расіі ў яе ўжо больш за 200 аб'ектаў... Нядаўна ў расійскім горадзе Чабаксары адбылося ўрачыстае адкрыццё першай франчайзінгавай крамы беларускага брэнда NAVY (стыльнае адзенне). Набірае абароты і айчынная сетка пунктаў па продажы «кавы з сабой», — удакладняе суразмоўца.

Віцебскіх франшыз пакуль што няма. Дарэчы, цяперашні банкрут — прадпрыемства лёгкай прамысловасці «КІМ» — спрабавала стаць франшызай. Але ж гэты від бізнесу — не вырашэнне праблемы, а распаўсюджванне поспеху.

Ці ёсць прыбытак?

Вольга Лявонцьева патлумачыла, што прадпрымальнік, які вырашыў пачаць свой бізнес, купіўшы прыдатную франшызу, у першую чаргу зніжае ўласныя рызыкі. Вядома, што з 10 адкрытых новых бізнесаў 8 зачыняецца ў першы год. А пры выкарыстанні франчайзінгу рызыка няўдачы зніжаецца ў 10 разоў! Сакрэт поспеху тлумачыцца проста. Па-першае, франчайзі (той, хто купіў франшызу) пачынае свой бізнес па ўжо праверанных тэхналогіях, пад вядомым імем і рэпутацыяй. А па-другое, бізнес працуе з падтрымкай і пад кантролем франчайзера (прадаўца франшызы). Апошні таксама, як і франчайзі, зацікаўлены ў паспяховай працы ўсіх пунктаў сеткі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.035. Нумар падпісаны ў 19.30 24 лістапада 2015 года.